ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 35 (1304) | ПЯТНІЦА, 13-га лютага 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 60 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

„Дактаровіч" ва ўсеузброеньні ідзе насустрач вясьне

Савгас „Дактаровіч" ударна рыхтуецца да правядзеньня вясеньняй пасеўкампаніі. Рабочыя і кіраўніцтва савгасу склалі міжсобку ўмову на соц. спаборніцтва. Рабочыя ўзялі на сябе абавязацельства добра выконваць працу, не рабіць прагулаў, актыўна ўдзельнічаць у вытворчых нарадах, разгортваньні рацыяналізатарства і вынаходзтва, а кіраўніцтва савгасу ўзяло абавязацельства сваечасова скласьці вытворчы плян, давесьці яго да кожнага рабочага і інш. Соц. умова пасьпяхова выконваецца. Плян пасеўкампаніі складзены, прапрацаваны на вытворчай нарадзе і ўжо даведзены да кожнага рабочага.

Савгас скончыў ачыстку насеньня і рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтара. Зернячышчальныя машыны савгас накіраваў цяпер на дапамогу колгасам і аднаасобным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам. Каробка

ВЫРАШЫЦЬ ПРОБЛЕМУ ПАЛІВА

Пасьпяхова выканаўшы плян мінулых год пяцігодкі, мы прыступілі да выкананьня плянаў рашаючага, трэцяга году пяцігодкі. Кантрольныя лічбы гэтага году намячаюць яшчэ больш гіганцкі крок уперад.

Значна ўзьнялася дабыча вугалю, многа перавысіўшы даваенную. Але каменна-вугальная вытворчасьць адстае яшчэ ад тэмпаў агульнага развіцьця краіны. Вынікі шкодніцтва, недахоп рабочай сілы, старыя мэтады здабычы—усё гэта спрыяла адставаньню каменна-вугальнай прамысловасьці.

Першы месяц гэтага году даў значны зрух, але зрух недастатковы.

Студзенскі плян выканан за першую палову месяцу толькі на 35,5 проц., што выклікала, побач з гіганцкім ростам патрэбнасьцяў, моцныя цяжкасьці ў забясьпечаньні апалам.

Тав. Орджонікідзэ ў сваім дакладзе на прамысловым зьезьдзе сказаў: „дагэтуль апалу хапала і проста ня думалі аб экономіі, але зараз яго не хапае і таму аб гэтым трэба падумаць".

Шэраг прадпрыемстваў выяўляе нядапушчальныя, барбарскія адносіны да экономіі апалу.

Факты злачынных адносін да апалу на шклозаводзе „Пролетары", недбайнасьць да рацыянальнага і экономнага скарыстаньня апалу на „Комунары", адсутнасьць усякага ўліку на „Энэргіі" (Менск) яскрава паказваюць, што гэтым пытаньнем нікто не займаецца.

Матар'ялы, пададзеныя рэйдам ударных брыгад, юнкораў „Чырвонай Зьмены" сьведчаць аб гэтым. Некаторыя гора-кіраўнікі, замест падтрымліваньня ініцыятывы і рэалізацыі прапаноў, як гэта было з прапановамі рабочых заводу „Комунар", бюрократычна аднесьліся да іх.

Барацьба за вырашэньне проблемы апалу ва ўмовах Беларусі павінна мобілізаваць максымум увагі, каб пасіліўшы тэмпы лесанарыхтовак і торфараспрацовак, палепшыць працу транспарту і экономнае скарыстаньне апалу, дабіцца ліквідацыі гэтага вузкага месца ў сыстэме нашай народнай гаспадаркі.

Комсамольскія арганізацыі на заводах павінны мобілізаваць сваю ўвагу на выкананьне прамфінпляну і асабліва яго якасных паказчыкаў, паставіўшы на вышэйшую ступень экономію паліва, стварыўшы спэцыяльныя пасты для праверкі скарыстаньня апалу, змагаючыся за правільнае захоўваньне яго, дабіваючыся прэміяваньня лепшых качагараў-ударнікаў.

Комсамол чыгункі павінен забясьпечыць сваечасовую дастаўку ў месца выгрузкі.

Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на торфараспрацоўкі. Беларусь багата тарфянікамі. Торф павінен скараціць да мінімуму выдаткаваньне вугалю і дроў. На гэты вузкі ўчастак неабходна кінуць свае сілы.

Прыйшоў час узьняць пытаньне аб максымальным скарыстаньні мясцовых запасаў паліва, якія яшчэ не крануты.

„Вузкае" месца—проблема апалу павінна быць і будзе ліквідавана.

КАРАБІНАМ І ГУМОВАЙ ПАЛКАЙ НЕ НАЛАДЗІЦЬ СПАКОЙ І ПАРАДАК

Беспрацоўныя сьвету 25-га лютага выйдуць на вуліцу і прад'яваць ордэр на „працу і хлеб!"

Адозва комсамолу Нямеччыны

БЭРЛІН. Камуністычны саюз моладзі Нямеччыны і юнацкая сэкцыя рэволюцыйнай профопозыцыі зьвярнуліся з супольнай адозвай да ўсёй працоўнай моладзі аб падрыхтоўцы да „Міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем"—25-га лютага.

Адозва паказвае, што ва ўсім сьвеце налічваецца больш 25 мільёнаў беспрацоўных. У Нямеччыне армія беспрацоўных дасягнула 5 млн. і, акрамя таго, 3 млн. рабочых працуюць скарочаны час. Без работы знаходзіцца больш аднаго мільёна працоўнай моладзі і скарочаны тыдзень працуюць—600 тыс. маладых рабочых.

— Галеча працоўнай моладзі, — адзначае адозва,—павялічваецца з кожным днём. Ня маючы надзеі атрымаць у капіталістычным сьвеце работу, шмат маладых рабочых канчаюць самагубствам. Вынікам дзейнасьці ўраду Брунінга зьяўляецца скарочаньне выдаткаў на соцыяльныя патрэбы, ў асаблівасьці выдаткаў на дапамогу для беспрацоўных.

Соцыял-дэмократычная партыя і саюз соцыял-дэмократычнай моладзі —гаворыцца далей ў адозьве,—прапануюць для наслабленьня беспрацоўя на адзін год падоўжыць заняткі ў школах, увесьці прымусовую працу. і наогул усякім чынам надтрымліваюць мерапрыемствы буржуазіі, накіраваныя супроць беспрацоўнай моладзі. Нацыянал-соцыялістыя (фашыстыя) патрабуюць увядзеньня працоўнай павіннасьці і прымусовай працы і заспакойваюць беспрацоўных пэрспэктывамі іх „трэцяй імпэрыі".

— У капіталістычным сьвеце,— канстатуе адозва,—няма ніякага выхаду з голаду і галечы. Капіталістычная сыстэма ня ў стане больш гарантаваць рабочай клясе нават мінімуму для існаваньня. Пры дапамозе гумовых палак і карабіна капіталістыя думаюць устанавіць спакой і парадак. Мы павінны мобілізаваць усю беспрацоўную і працоўную моладзь супроць масавай эксплёатацыі і юнгаўскага грабежніцтва і організаваць адзіны фронт усіх соцыял-дэмократычных, каталіцкіх, фашысцкіх і беспартыйных маладых рабочых і правесьці такім чынам міжнародны дзень беспрацоўных—25 лютага.

Адозва канчаецца словамі: „Ня гледзячы на забарону, 25-га лютага павінны адбыцца буйнейшыя дэмонстрацыі. Мы павінны расказаць працоўнай моладзі, як жыве моладзь у Савецкім Саюзе, дзе няма беспрацоўя. 25-га лютага мы павінны таксама мобілізаваць рабочую моладзь для абароны Савецкага Саюзу".

Правадыр „Грамады" Б. Тарашкевіч у кіпцюрох дыфэнзывы

Як паведамляе польскі друк, пры вельмі таемнічых акалічнасьцях у польскім калідоры на станцыі Жчэў, у экстэрытарыяльным вагоне нямецкага цягніка арыштаваны былы дэпутат польскага сойму Браніслаў Тарашкевіч—адзін з правадыроў стотысячнай беларускай работніцка-сялянскай Грамады, разгромленай польскім фашызмам. Б. Тарашкевіч па справе Грамады быў у свой час асуджаны польскім фашыцкім судом на 6 год катаргі. Пасьля 3 год зьняволеньня ў турме Вронкі фашыцкі ўрад асвабадзіў Тарашкевіча, разьлічваючы, што яму ўдалося зламаць Тарашкевіча і выкарыстаць яго ў сваіх мэтах. Фашыцкі ўрад памыліўся, Тарашкевіч мужна выступіў супроць окупантаў Зах. Беларусі і іх беларускіх лакеяў нацыянал-фашыстых. Фашыцкі урад пачаў рыхтаваць новыя працэсы супроць Тарашкевіча. Б. Тарашкевіч выехаў у Нямеччыну і адсюль працягваў бязупынную барацьбу супроць фашыцкага ладу і польскага імпэрыялізму.

Арыштаваны пры таемнічых акалічнасьцях Тарашкевіч па загаду судзьдзі сьледчага —а насправе па загаду фашыцкай ахранкі (дыфэнзывы), пасаджан у турму папярэдняга зьняволеньня ў Варшаве. Справа Тарашкевіча даручана сьледчаму Кваткоўскаму, які вядзе звычайна справы супроць комуністых, і якога вельмі добра ведаюць ахвяры Луцкага засьценку.

Гамбургскія партавыя рабочыя абвясьцілі забастоўку

БЭРЛІН. 12.—Учора ў адпаведнасьці з пастановай цэнтральнага забастовачнага камітэту рэволюцыйнай профопозыцыі, забаставалі гамбурскія партовыя рабочыя. Вялікая частка партовых рабочых спыніла работу.

Рэформістыя імкнуцца ўсімі сродкамі сарваць забастоўку і згадзіліся прызнаць трацейскае рашэньне якое прадугледжвала зьніжэньне зарплаты. Рэформістыя сваёй штрэйкбрэхэрскай дзейнасьцю апіраюцца на паліцыю.

У памяшканьні мясцовых забастовачных камітэтаў паліцыя налазіла вобыскі. Частка памяшканьняў занята паліцыяй. Члены забастовачнага камітэту арыштаваны. Лік арыштаваных партовых рабочых—25 чалавек.

Бэрлін тысяча дзевяцьсот трыццаць першага году

(З блёк-ноту)

Таксі застаўся на вуліцы без нагляду. У адно імгненьне ён зьнік. Яго „пазычыў" беспрацоўны. „Злодзею" удалося надвезьці пасажыра і зарабіць чатыры маркі. Ілжэ-шофэр ужо зьбіраўся пакінуць аўтомобіль, але тут яго схапілі шупманы (паліцэйскія) і накіравалі ў турму.

Гэта штодзённая зьява ў Бэрліне.

Жабрацтва, рабункі, і крадзеж памнажаюцца не па днях, а па гадзінах. Хто робіць большасьць злачынстваў? Беспрацоўныя. Адзінаццаць самагубстваў у дзень—сярэдняя лічба для Бэрліну.

Хто вешаецца, хто выкідваецца з вокан, атручваецца газам? Беспрацоўныя.

* * *

Дапамога па беднасьці: 9 марак 87 пфэнігаў на сём дзён.

Што значыць гэтая сума?

Плата за кватэру—5 марак.

2 хлябы—1 марка.

250 грам каўбасы—1 марка.

Маргарын—1 марка.

Мыцьцё, мыла, трамваі, дробная пачынка плацьця—1 марка 87 пфэнігаў.

Аб гарачым сьнеданьні, аб тым каб набыць вопратку ня прыходзіцца і думаць. Нічога не застаецца на апал кватэры, ня кажучы аб культурных выдатках, накшталт кіно ці тэатру.

Так жыве чвэртка мільёну пролетарыяў Бэрліну, а з сем'ямі— ня менш 500.000 чал.

* * *

З 4750 тыс. беспрацоўных нямецкіх пролетарыяў (афіцыйная лічба на 15 студзеня) амаль паўмільёна прыпадае па сталіцу.

З іх 50.000 не атрымліваюць ніякай дапамогі. З членамі сям'і гэта дае ня менш 100.000 чалавек, якія бадзяюцца па вуліцах Бэрліна, ня маючы ніводнага пфэніга сталага прыбытку.

* * *

Нататка з бэрлінскай газэты:

„У сувязі з хуткім ростам ліку беспрацоўных пункт па выдачы дапамогі ў раёне Панкаў (Бэрлін) вымушан быў затрымаць выплату дапамогі. Націск у дзень выдачы быў такі, што двое беспрацоўных былі адпраўлены ў бальніцу, адзін са зламаным рабром, другі з кровазьліяньнем у лёгкія". У такіх умовах вымушаны беспрацоўны атрымліваць свае жабрацкія пфэнігі.

* * *

16.000 кватэр стаяць у Бэрліне пустымі—з іх 3000 нядаўна адбудаваны. Побач з гэтым 200.000 рабочых (з сем'ямі—350.000 чал.) ня маюць прытулку і начуюць у парках, у сутарэньнях, на вышках, у начлежках. Яны жывуць, у лепшым выпадку, па 6 і па 8 чалавек у адным пакоі, у поўразваленых дамох-казармах.

Штодзённыя сцэны: пажыткі беспрацоўнага выкідаюць з кватэры за няўплату. Нярэдка натоўп беспрацоўных заносіць мэблю назад у кватэру.

У адным з раёнаў беспрацоўныя разбурылі вугальны склад. Усё часьцей становяцца баявыя масавыя выступленьні беспрацоўных, усё часьцей чуецца гнеўны воклік: Далоў урад капіталістых, урад голаду і жабрацтва!

Г. Браун

Руйнуючы перашкоды, ісьці да перамог у 3-м, рашаючым

9-га лютага, у Гомелі адбыўся агульна-гарадзкі сход комсамольскага актыву, сумесна з комсамольскай конфэрэнцыяй авія-брыгады. На сходзе сэкратар ЦК ЛКСМБ, тав. Гуткін зрабіў даклад: „Аб выніках Х-га зьезду ЛКСМБ і ІХ-га—УсеЛКСМ".

У сваім паўтарагадзінным дакладзе тав. Гуткін падрабязна спыніўся на пытаньнях замежнага і ўнутранога стану СССР, становішча УсеЛКСМ і ролі, якую ён адыгрывае ў рэконструкцыйны пэрыод. Дакладчык падаў шэраг цікавых фактаў аб рабоце комсамолу і асаблівую ўвагу ўдзяліў пытаньням шэфства комсамолу над паветраным і морскім флётамі і вайсковай працы комсамолу.

Тав. Гуткін падрабязна спыніўся на задачах, што стаяць перад ЛКСМБ, у зьвязку з выкананьнем рашэньняў зьездаў.

Пасьля дакладу разгарнуліся жвавыя спрэчкі.

Тав. Каганскі (Гомсельмаш), спыніўшыся на дрэннай вайсковай працы комсамолу Гомельшчыны, унёс прапанову для лепшага вывучэньня рашэньняў зьездаў, уключыць гэтыя пытаньні ў політбой, які зараз падрыхтоўвае Гомельская організацыя ЛКСМБ.

У спрэчках аддавалася шмат увагі пытаньням вывучэньня тэхнікі ў арміі і на вытворчасьці. Аб гэтым гаварылі т.т. Міклашэўскі, Бокарэвіч і інш.

Начподзіва авіябрыгады, тав Крылевецкі, прывёў рад фактаў, якія сьведчаць аб вялікай актыўнасьці комсамолу і б'юць енкі гора-тэорэтыкаў тыпу Целеша а аб крызісе актыўнасьці.

Тав. Крылевецкі адзначыў, што кожная вайсковая адзінка павінна адчуваць адказнасьць за вайсковую работу ў комсамоле, чаго ў нас дагэтуль ня было. „І калі,—кажа ён,—у комсамоле ў гэтым напрамку дрэнна, то гэта наш промах".

Тав. Ліпковіч (электростанцыя) расказаў як комсамольцы Гомельшчыны пачынаюць ажыцьцяўляць шэфства над электрыфікацыяй.

Яны ўжо ў другі раз пасылаюць у Донбас спэцыяльныя эшалёны з лесаматар'ялам і ў замен прывозяць вугаль для электростанцыі. Гэтыя эшалёны абслугоўваюцца комсамольскай ударнай брыгадай. Аднак, шэфства над электрыфікацыяй разгорнута яшчэ недастаткова.

Тав. Туроўскі (Беліца ЦРК) адзначыў, што „Чырвоная Зьмена", якая занесла колектыў ЛКСМБ ф-кі „Везувій" на чорную дошку, не аказала яму дапамогі зыйсьці з яе. Прамфінплян на гэтым прадпрыемстве да гэтага часу ня выконваецца.

Тав. Шаўчанка, спыніўшыся на дрэнным становішчы ФЗВ чыгуначнікаў, асабліва падкрэсьліў, што падрыхтоўку да лютаўскага набору зрывае аддзел кадраў Калуцкай чыгункі.

Тав. Рахлін (ф-ка „Праца") спыніўся на тым, як ф-ка „Праца" выконвае прамфінплян. Колектыў ЛКСМБ рашэньні зьезду ўжо конкрэтна праводзіць у жыцьцё. Ён уключыўся ў скразны соцыялістычны конвэер якасьці па гарбарнай і абутковай прамысловасьці БССР, які праводзіцца па ініцыятыве комсамольцаў Віцебскай абутковай фабрыкі імя Лекерта і „Чырвонай Зьмены".

Акрамя гэтых таварышоў у спрэчках выказаліся тав. Пацукоў Комісарчык. Рубін і інш.

Тав. Рубін завастрыў увагу актыву на дрэнным становішчы гомельскага чыгуначнага вузла, асабліва комсамольскай організацыі на чыгунцы, і вызначыў шэраг мерапрыемстваў, праз якія комсамольская організацыя павінна ажыцьцявіць рашэньні Саўнаркому і ЦК Усе КП(б) аб чыгунцы.

Тав. Гуткін даў падрабязны аналіз становішча комсамолу ў капіталістычных краінах і спыніўся на конкрэтных мерапрыемствах па ажыцьцяўленьню рашэньняў зьездаў. асабліва на пытаньні організацыі скразнога конвэеру якасьці па гарбарнай прамысловасьці.

У прынятай пастанове па дакладу тав. Гуткіна гомельскі актыў поўнасьцю падтрымаў рашэньні зьездаў комсамолу і вызначыў шэраг мерапрыемстваў для іх ажыцьцяўленьня.

У зьвязку з пяцідзесяцігодзьдзем тав. Варашылава, актыў паслаў яму прывітальную тэлеграму. Актыў ЛКСМБ Гомсельмашу ўнёс на пабудову дырыжаблю „Клім Варашылаў" 22 р. і выклікаў астатнія ячэйкі.

КАГ.

УСЕ СІЛЫ НА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ БАЛЬШАВІЦКАГА ПЛЯНУ

АБ КАНТРАКТАЦЫІ ЯРАВЫХ КУЛЬТУР ПАСЕВУ 1931 г.

У выкананьне дырэктывы Савету Народных Камісараў СССР і Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) ад 21-га студзеня 1931 г. аб мерапрыемствах па дапамозе савецкай дзяржавай вёсцы па колектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і ажыцьцяўленьню задачы ліквідацыі кулацтва як клясы па капітальнаму ўкладаньню ў сельскую гаспадарку і па кантрактацыі ў весну 1931 г., ЦК КП(б)Б і СНК БССР лічаць неабходным ажыцьцяўленьне наступных мерапрыемстваў:

I. Мерапрыемствы дапамогі дзяржавай сельскай гаспадарцы

1. Накіраваць у сельскую гаспадарку БССР на працягу 1931 году 1528 трактароў (у пераводзе на 10-ні сільныя).

2. Давесьці агульны лік трактарных станцый на працягу 1931 г. да 24-х станцый з трактарным паркам у 14265 сіл, якія-б забясьпечылі б пасеў машына-трактарнымі станцыямі ўвесну 1931 г. 230.000 га.

Накіраваць на капітальнае будаўніцтва МТС у 1931 годзе 6936 тыс. руб.

3. Пабудаваць 34 новых ільна-апрацоўчых заводаў для перашапачатковай апрацоўкі лёну.

4. Давесьці забясьпечаньне сельскай гаспадарк ў 1931 годзе сел ска-гаспадарчымі машынамі на суму да 26.500 тыс. руб.

Накіраваць асноўную частку гэтых машын у колгасы і МТС па ўстаноўленых паніжаных дзяржаўных пэнах.

5. Забясьпечыць сельскую гаспадарку ў 1931 годзе штучнымі ўгнаеньнямі ў колькасьці 181,6 тыс. тон агульнай каштоўнасьцю 3.700 тыс. руб., у тым ліку да вясны 108 тысяч.

6 Забясьпечыць сельскую гаспадарку сродкамі барацьбы са шкоднікамі па сэзону на суму 217 тыс. руб.

7. Забясьпечыць саўгасы і колгасы гатунковым і палепшаным насеньнем згодна пастаноў СНК пра вясновую сельска-гаспадарчую кампанію 1931 г.

Сартавое насеньне збожжавых культур адпушчаць выключна ў парадку абмену на звычайнае зярно, а насеньне тэхнічных культур і бульбы—у парадку кантрактацыі са зваротам у восень 1931 г. Вінаватыя ў выдачы сортнасеньня без абмену нясуць адказнасьць, як за растрату дзяржаўнай маёмасьці.

Выходзячы з вышэйпаданага, і ў мэтах карэннага палепшаньня забясьпячэньня прамысловасьці сыравінай і працоўных харчамі, абавязаць НКГандль і НКЗем правесьці праз сыстэму сельска-гаспадарчай кооперацыі і Трактарцэнтр кантрактацыю яравых культур на наступных падставах:

II. Агульныя палажэньні па кантрактацыі

1. Агульнае кіраўніцтва і нагляд за правядзеньнем усіх відаў кантрактацыі пасеваў 1931 году ажыцьцяўляецца НКГандлю і яго мясцовымі органамі, а непасрэдна правядзеньне кантрактацыі ўскладаецца на спэцыяльныя сыстэмы сельска-гаспадарчай кооперацыі ў вызначаных для іх раёнах. У тых раёнах, дзе няма адпаведнай спэцыяльнай сыстэмы сельска-гаспадарчай кооперацыі, цэнтр вядучай сыстэмы сельска-гаспадарчай кооперацыі складае генэральны дагавор з іншымі цэнтрамі сельскагаспадарчай кооперацыі. Апошнія непасрэдна кіруюць сваёй нізоўкай па ўсіх відах кантрактацыі.

Кантрактацыя збожжавых культур праводзіцца спэцыяльнымі сыстэмамі сельска-гаспадарчай кооперацыі самастойна без складаньня генэральных дагавораў.

2. Кантрактацыя садовіны і ягады ў індывідуальных гаспадарках вытвараецца сыстэмаю спажывецкай кооперацыі, якая таксама кантрактуе сады ў гарадох, садавіну, гародніну і ягады ў прыгарадных колгасах у межах вызначанага НКГандлю пляну.

Даручыць Гарадзкім Саветам выдаць адпаведныя пастановы аб кантрактацыі з боку ЦРК.

3. Кантрактацыя вытвараецца ў колгасах, вытворчых т-вах, паселішчах і групах пасеўшчыкаў. Правядзеньне кантрактацыі садовіны і ягаднікаў дапусьціць таксама і ў аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках.

4. Вытворчыя аб'яднаньні, паселішчы прымаюць пляны кантрактацыі ў адпаведнасьці з прынятымі пасеўнымі плянам, пры чым пастанова бядняцка-серадняцкай большасьці аб складаньні дагавароў кантрактацыі зьяўляецца абавязковай для ўсіх сяброў паселішча, якія маюць права складаць дагаворы. Колгасы прымаюць плян кантрактацыі ў адпаведнасьці з прынятым вытворчым плянам, зацьверджаным райколгассаюзам.

Уся праца па кантрактацыі, уключаючы афармленьне дагавораў, павінна быць скончана да 1-га красавіка.

У кулацка-заможных гаспадарках кантрактацыя не праводзіцца, а яны атрымоўваюць цьвёрдыя заданьні па здачы продукцыі шляхам вызначэньня цьвёрдага заданьня па засеву.

5 У мэтах увязкі плянаў кантрактацыі з вытворчымі крэдытамі ўстанавіць, што вытворчыя крэдыты у тым ліку крэдыты на насеньне, штучнае ўгнаеньне, сельска гаспадарчыя машыны і прылады, ад усяго ідуць ў першую чаргу колгасам, а потым простым вытворчым аб'яднаньням, закантрактаваўшым свае пасевы.

6 Спэцыяльным цэнтрам сельска-гаспадарчай кооперацыі,—Белсельгасснабу, Саюзхлебу і Наркамзему,—забясьпечыць своечасовы завоз і разьмеркаваньне насеньня, штучнага ўгнаеньня, сельска-гаспадарчых машын і прылад па пасобных раёнах.

7. Выплату пасеўшчыкам за зданьне па дагавору кантрактацыі продукцыю ўтвараць па нарыхтоўчым цэнам, якія будуць устаноўлены НКГандлю на 1931-32 год, з адпаведнымі надбаўкамі за гатунковасьць.

8. Па культурах, для якіх дагаворам кантрактацыі прадугледжваецца здача поўнага процанту валавога збору законтрактаванай продукцыі, канчатковы колькасны размер здачы продукцыі ўстанаўліваецца па выяўленьню ўраджаю, але не пазьней чым за месяц да пачатку ўборкі камісіяй, склад якое вызнач ецца інструкцыяй Наркомгандлю. Колькасьць продукцыі, здаванай аднаасобным сэктарам, павінна быць не ніжэй колькасьці здаванай з кожнага бліжэйшым колгасам.

9. Авансавая кантрактацыя ў першую чаргу праводзіцца ў колгасах, а потым у бядняцка-серадняцкіх гаспадарках.

Нормы грашовага авансаваньня для аднаасобных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак устанавіць на $^{1}/_{3}$ ніж й норм авансаваньня колгасаў, з налічэньнем: для колгасаў і бядняцкіх гаспадарак—7 проц. і серадняцкіх—10 проц. галоўных.

10. Даручыць НКГандлю забясьпечваць у першую чаргу дэфіцытнымі прамтаварамі колгасы і бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, якія закантрактавалі свае пасевы.

III. Па збожжавых культурах

1. План кантрактацыі збожжавых устанавіць:

аўса	302 тыс. га,	у тым ліку на колгасах 48 тыс. га
ячменю	105 „ „	13 „ „
крупяных	40 „ „	11 „ „
бабовых	13 „ „	8 „ „
Разам	460 „ „	80 „ „

У гэтым ліку размер таварна-сартавое кантрактацыі аўса вызначыць у 180 тыс. га.

2. Звыш вытворчых крэдытаў устанавіць выдачу грашовых авансаў па кантрактацыі бабовых культур на плошчу 6,5 тыс. га сярэднім размерам грашовага авансу 9 руб на закантрактаваны га.

3. Норму здачы закантрактаванай продукцыі для колгасаў устанавіць 10 проц. па збожжавых і 50 проц. па бабовых валавога збору закантрактаванай плошчы, а для аднаасобнага сэктару па збожжавых—1/8 і па бабовых—50 проц валавога збору з кантрактацыйнай плошчы.

4. Устанавіць, што патрэбныя для правядзеньня таварна-сартовай кантрактацыі аўса—360 тыс. цэнтн. насеньня пакрываюцца з наступных крыніц: цэнтралізаваных загатовак і дзяржнасенфонду—120 тыс. цэнтн., а астатнія 240 тыс. цэнтн. пакрываюцца за рахунак насеньня самых пасеўшчыкаў у парадку ўнутрысялянскага абмену.

5. Тэрмін здачы кантрактоўшчыкамі закантрактаванай продукцыі ўстанавіць: 30 верасьня 1931 году—30 проц. і не пазьней 30-XI-31 г.—70 проц.

IV. Па ільну і каноплі

1. План кантрактацыі ўстанавіць.

а) па ільну 190 тыс. га, з якіх у раёнах, абслугоўваемых МТС—37 тыс. га;

б) па канопзях—18 тыс. га.

2. Кантрактацыю лёну праводзіць ва ўсіх ільнаводных і асноўных таварных раёнах ільнаводства, а каноплі у таварных пянькавых раёнах; у астатніх неільнаводных і непенькаводных раёнах кантрактацыя праводзіцца выключна ў колгасах.

Сьпіс раёнаў, у якіх вытвараецца кантрактацыя ільна і пянькі, устанаўлівае ца НКЗ і НКСнабам.

3. Кантрактацыя вытвараецца.

а) у колгасах—100 проц. пасеўнай плошчы ва ўсіх раёнах,

б) у індывід. сэктары;

у ільнаводн. р.—85 проц. пасеўнай плошчы ва ўсіх раёнах.

у неільнаводных р.—56 проц. пасеўнай плошчы ва ўсіх раёнах.

4. Звыш вытворчых крэдытаў устанавіць выдачу грашовых авансаў па ільну—на 105 тыс. га. з сярэднім размерам авансу—30 руб, на га, а па канаплям—18 тыс. га, па 55 руб. на га.

Аванс выдаецца: 40 проц. перад пасевам і 60 проц. перад уборкай. Канчатковы тэрмін устанаўляецца НКГандлю.

У мэтах стымуляваньня спэцыялізацыі раёнаў у ільнаводным напрамку, авансавую кантрактацыю праводзіць выключна ў ільнаводных пры заводаскіх, фабрычных, экспортных і прымежных да іх ільнаводных раёнах пры чым ва ўсіх гэтых раёнах авансуецца поўнасьцю ўся плошча колгасу і пашыраемая плошча ў аднаасобным сэктары з застаньшыхся сум пасьля задавальненьня колгасаў.

6. Насеньне для пасеву лёну і каноплі адпускаецца па нарыхтоўчых цэнах з надбаўкай у 15 проц.

7. Парадак разьліку за адпускное насеньне колгасам і аднаасобным бядняцкім і серадняцкім гаспадаркам устанаўліваецца НКСнабам і НКЗем.

Пагашэньне пазыкі ўтвараецца пазьней 1-XII—31 г.

8. У ільнаводных і канопляводн[illegible] раёнах выдаць пасеўшчыкам лёну [illegible] каноплі 1.25 цэнтн хлеба супроць [illegible] цэнтн. здаванага валакна з тым, [illegible] да вясеньняга пасеву ў лік гэтай но[illegible] мы было выдадзена па 0,5 проц. цэ[illegible] тнэра на га.

9. Захаваць на 1931 год забясь[illegible] чаньне здатчыкаў насеньня лёну і [illegible] ноплі алеем і макухай па норм[illegible] 1930 году (7 кілёграм алею і 10 кі[illegible] грам макухі супроць 1 цэнтнэра іль[illegible] насеньня—для колгасаў; 5,7 кілегр[illegible] алею і 8 кілеграм макухі для ад[illegible] асобнікаў).

10. Аслабаніць ад звычайных но[illegible] здачы хлеба ўраджаю 1931 году ко[illegible] гасы і аднаасобныя бядняцка-сера[illegible] няцкія гаспадаркі ільно-канопляводч[illegible] раёнаў пры ўмове засеву гэтымі га[illegible] падаркамі ня менш 10—15 проц. [illegible] ву, альбо ня менш 5—7 проц. кано[illegible] лі ад агульнай пасеўнай плошчы і п[illegible] абавязковым выкананьні імі здачы [illegible] ку па кантрактацыйнай умове.

11. Нормы здачы закантрактаван[illegible] продукцыі ўстанавіць у колгасах і [illegible] наасобных гаспадарках у процант[illegible] да ўсяго валавога збору закантрак[illegible] ванай плошчы; па ільна-валакну—[illegible] проц., па ільнанасеньню—55 про[illegible] па пеньку і канапляному насеньню 50 проц.

12. Устанавіць наступныя тэрмі[illegible] здачы закантрактаванай продукцыі;

	4 кв. 31 г.	1 кв. 32 г.	2 кв. 32 г.
Ільнанасеньне	100 проц.	—	—
Салома і траста	100 „	—	—
Ільнавалакно	70 „	30 проц.	—
Пянька	30 „	30 „	40 проц.
Канапл. насеньне	100	—	—

V. Па бульбе.

1. План кантрактацыі ўстанавіць у 122 тыс. га, з якіх: 62 тыс. га тэхнічнай бульбы, 57 тыс. га сталовай— і 3 тыс. га раньняй сталовай бульбы; у гэтым ліку па колгасах 40 тыс. га і аднаасобным сэктары—82 тыс. га.

2. Звыш вытворчых крэдытаў устанавіць выдачу грашовых авансаў па плошчы 25 тыс. га тэхнічнай бульбы з сярэднім размерам авансу у 32 руб. на га.

3. У мэтах стымуляваньня пасеваў тэхнічнай бульбы ў раёнах броварных і крухмальных заводаў авансавую ка[illegible] трактацыю праводзіць выключна у [illegible] тых раёнах і выключна ў колгасах.

4. Нормы здачы бульбы з 1 зака[illegible] трактаванага га ўстанавіць у 5 тон.

5. Тэрмін здачы закантрактаван[illegible] продукцыі ўстанавіць:

Бульбы раньняй—50 проц. да 25-[illegible] 50 проц.—15-VIII.

Бульбы сталовай—30 проц. да 1-[illegible] 31 г., 45 проц.—1-XI-31 г.; 25 проц. 15-IV 1932 г.

Бульбы тэхнічнай—30 проц. 1-X, [illegible] проц.—1-XI, 25 проц.—15-XII.

VI. Па садавіне і гародніне

1. План кантрактацыі ўстанавіць:

Па гародніне—у 8. 500 га з якіх колгасах—8.000 га.

У тым ліку:

а) капусты позьняй	2600
б) „ раньняй	330
в) цыбулі	830
г) гуркоў	1860
д) морквы	800
е) бручкі	560
ж) буракоў сталовых	1020

Па парніковых рамах (выключна [illegible] колгасах)—45.000 штук. Па садовін[illegible] а) садоў—8.500, з іх колгасах—7.000 г[illegible] б) ягаднікаў—400, з іх у колгасах—100 г[illegible]

Па цыкорыю (выключна ў колгаса[illegible]) —300 га.

2. Звыш вытворчых крэдытаў уст[illegible] навіць выдачу грашовых авансаў [illegible] цыкорыю ў колькасьці 125 руб. на г[illegible]

3. Тэрміны і нормы здачы закантра[illegible] таванай продукцыі садавіны і гародн[illegible] ны ўстанаўліваюцца інструкцыяй Нар[illegible] комгандлю.

4. У мэтах забясьпечаньня буйны[illegible] гарадоў БССР гароднінай, даручыц[illegible] НКГандлю прымацаваць да буйны[illegible] ЦРК раёны кантрактацыі гародніны н[illegible] аснове умоў непасрэдна з Райкоопса[illegible] юзам, згодна генэральнага дагавор[illegible] паміж Белсадсаюзам і Белкоопсаюза[illegible]

Даручыць НКГандлю, спэцыяльны[illegible] сыстэмам сельска-гаспадарчай коопе[illegible] рацыі і НКЗему скласьці інструкцы[illegible] аб парадку правядзеньня кантрактацы[illegible] а так сама і тыпавыя дагаворы.

НКГандлю распрацаваць адзіны ты[illegible] повы дагавор па кантрактацыі ільну [illegible] каноплі, а другі—па кантрактацыі ўсі[illegible] астатніх культур.

Савет Народных Камісараў БССР [illegible] Цэнтральны Камітэт КП(б)Б заклікаюць усе партыйныя, савецкія гаспадарчыя, кооперацыйна-колгасныя і комсамольскія арганізацыі ўзяцца па бальшавіцку за справу кантрактацыі яравых пасеваў, мобілізаваць свае сілы [illegible] растлумачыць масам рабочых, колгасьнікам і бядняцка-серадняцкім масам вёскі значэньне правадзімых савецкай уладаю мерапрыемстваў па тэхнічна[illegible] перазбраеньню і колектывізацыі сельскай гаспадаркі, стаць на чале новага ўздыму колгаснага руху мільённых мас вёскі і забясьпечыць гэтым самым рашучыя посьпехі ў справе ліквідацыі кулацтва як клясы і соцыялістычнай перабудовы вёскі.

Даручыць усім партыйным, савецкім і гаспадарчым організацыям організаваць шырокую прапрацоўку адозвы (пастановы) ЦК УсеКП(б) і СНК СССР ад 21-I-1931 г. па кантрактацыі.

Старшыня СНК БССР Галадзед.

Сакратар ЦК КП(б)Б Гей.

15.000 комсамольцаў на правядзеньне контрактацыі

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ

Адозва ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, СНК СССР і БССР аб кантрактацыі яравых пасеваў у 1931 г., мае выключна важнае гаспадарча-палітычнае значэньне. Кантрактацыя павінна стаць адным з важнейшых рычагоў пасьпяховага правядзеньня другой бальшавіцкай вясны і выклікаць новую, яшчэ больш магутную, хвалю колгаснага руху, яшчэ большае згуртаваньне бядняцка-серадняцкіх мас вёскі на рашучую барацьбу з кулацтвам, ліквідуючы яго як клясу на базе суцэльнай колектывізацыі.

Укладаньне ў сельскую гаспадарку дзяржаўных сродкаў па 26,5 млн. руб. сель-гас. машынамі і 181.600 тон мінэральных угнаеньняў дасьць сельска-гаспадарчаму сэктару непамернае павялічэньне сродкаў вытворчасьці, больш чым у мінулым годзе. Дзеля гэтага высунутыя партыяй і ўрадам задачы кантрактаваць 460.000 га збожжавых культур, 120.000 га ільна, 18.000 га каноплі, 120.000 га бульбы, 8.500 га гародніны і 8.500 га садовіны і шэраг іншых культур абавязваюць ЛКСМБ неадкладна ўключыць усе звеньні саюзу для мобілізацыі колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас на пасьпяховае і поўнае выкананьне пляну кантрактацыі.

Выходзячы з гэтага, ЦК ЛКСМБ—пастанаўляе:

1) Райкомам і ячэйкам заразжа разгарнуць масавую растлумачальную працу сярод комсамольцаў, колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі аб гаспадарча-палітычным значэньні адозвы ЦК і СНК. На працягу лютага м-ца, разам з правядзеньнем плянаў вясновай сяўбы, давесьці планавыя заданьні па кантрактацыі да колгасу, таварыства і паасобнага бядняцка-серадняцкага двара, організаваўшы хвалю сустрэчных плянаў, дабіўшыся іх выкананьня і перавыкананьня.

2) Выкананьне плянаў кантрактацыі павінна садзейнічаць найхутчэйшаму і пасьпяховаму правядзеньню вясеньняй сяўбы і спэцыялізацыі сельскае гаспадаркі. Дзеля гэтага РК і ячэйкі павінны забясьпечыць поўнае выкананьне плянаў як па сяўбе, так і па кантрактацыі, асабліва па ільнавалакну, бульбе і збожжы, вядучы рашучую барацьбу з права-опортуністычнай практыкай, якая выяўляецца ў тэндэнцыі скараціць пляны пасеўнай плошчы і кантрактацыі.

3) Прасачыць за правільным правядзеньнем кантрактацыі, не дапушчаючы ні ў якім разе якіх бы там ні было скрыўленьняў, цьвёрда памятаючы што ў гэтым годзе кантрактуецца значна большая плошча пасеваў, што здача кантрактаванай продукцыі ў строга абмежаваныя тэрміны абавязвае комсамольскую организацыю яшчэ больш узмацніць барацьбу з опортуністычнай недаацэнкай кантрактацыі, змагацца за выразную і своечасовую работу ўсіх організацый, даючы рашучы адпор кулаку і яго агентам—правым опортуністам, якія будуць імкнуцца сарваць гэтае найважнейшае мерапрыемства партыі.

4) Праверыць і прыняць адпаведныя меры, пачынаючы ад цэнтральных і раённых устаноў і канчаючы сельсаветамі, па выкананьні імі дырэктывы партыі і ўраду аб своечасовым накіраваньні дзяржаўных сродкаў, прызначаных для развіцьця сельскае гаспадаркі, бо своечасовае прасоўваньне іх дасьць яшчэ большую магчымасьць выканаць своечасова і з посьпехам плян кантрактацыі. Абавязаць заразжа ўсе РК і ячэйкі правесьці кампанію „ЛК“ па ўсе гэтыя ўстановы, з пункту погляду своечасовай рэалізацыі імі адозвы ЦК УсеКП(б), КП(б)Б, СНК СССР і БССР, мобілізаваўшы друк як цэнтральны, так і раённы, для сыстэматычнай популярызацыі правядзеньня кантрактацыі.

5) Організаваць ударную ўсесаюзную брыгаду пры ЦК РК і ячэйках ЛКСМБ, якая па ўсей БССР павінна ахапіць ў агульнай колькасьці ня менш 15.000 комсамольцаў, непасрэдна працуючых па правядзеньню пляну кантрактацыі, усклаўшы адказнасьць за правядзеньне гэтага мерапрыемства ў ЦК ЛКСМБ—на тав. Рудніцкага, а ў РК і ячэйках—на спэцыяльна высунутага аднаго таварыша.

6) Лічыць неабходным організацыю спэцыяльнага прэміяльнага фонду для прэміяваньня лепшых брыгад і ўдарнікаў, выявіўшых сябе ў рабоце па кантрактацыі, аб чым паставіць пытаньне перад сельгас кооперацыяй, Наркамземам, Наркомснабам і профсаюзамі.

Абавязаць райкомы і ячэйкі прыцягнуць піонэр-організацыю і школьнікаў да практычнага ўдзелу ў рэалізацыі адозвы ЦК і СНК, усклаўшы адказнасьць на Бюро яч. за мобілізацыю піонэр організацыі на ўдзел у гэтым найважнейшым мерапрыемстве.

8. Абавязаць „Чырвоную Зьмену“, „Юнгер Арбайтэр“ разгарнуць работу па мобілізацыі комсамолу і працоўнай моладзі вакол рэалізацыі адозвы ЦК і СНК.

9) Лічыць неабходным на працягу лютага м-ца сыстэматычна правяраць выкананьне дырэктывы ЦК ЛКСМБ, для чаго на Бюро ЦК выклікаць ня менш 5 райкомаў і абавязаць раённыя к-ты КСМ правяраць работу ячэек шляхам выклікаў з дакладам на Бюро РК.

КОЖНУЮ КАЛЁРЫЮ ЦЯПЛЫНІ—НА ВУЧОТ

Шкло-завод „Пролетары“, заводы „Энэргія“ і „Комунар“ неэкономна выкарыстоўваюць апал

Аўладаць нетрамі беларускага Донбасу, даць здаровую страву социялістычным прадпрыемствам

Даць Менску апал

(Адкрыты ліст комсамольцам чыгункі)

Таварышы! Для штодзённага здаваль неньня Менску апалам патрэбна 100 вагонаў дроў (з якіх 45 для прамысловасьці і 55 для насельніцтва і розных устаноў). Штодзённа ў Менск паступае 5-6 вагонаў.

Лічбы гавораць аб пагражаючым становішчы забясьпечаньня рабочых Менску апалам. У свой час комсамольская ячэйка ВСНГ і Лесбелу мобілізавалася і праявіла належную ініцыятыву ў справе ўключэньня ўсёй комсамольскай організацыі БССР у бой за лесазагатоўкі Зараз дровы ляжаць ля чыгункі на ро ных станцыях вакол Менску, а ў гэты час Менск знаходзіцца пад пагрозай застацца бяз апалу.

Комсамольская ячэйка ВСНГ і Лесбелу зварочваецца да вас, комсамольцаў чыгункі, прыняць актыўны ўдзел у організацыі комсамольскіх эшалёнаў для дастаўкі апалу ў Менск з тым, каб ні на гадзіну апал не затрымліваўся каля чыгункі. Таксама зварочваемся да Менгаркому ЛКСМБ з прапановай мобілізаваць усю комсамольскую організацыю гораду Менску для ліквідацыі прарыву, наладзіўшы суботнікі па пагрузцы дроў з бліжэйшых станцый і дастаўцы іх у Менск.

Неабходна скласьці пры вытворчых комсамольскіх ячэйках брыгады, якія-б сачылі за экономным выдаткаваньнем апалу.

З комсамольскім прывітаньнем
Ячэйка ЛКСМБ ВСНГБ і Лесбелу



Даць вугаль!

Першы рэйд ударных брыгад „Чырвонай Зьмены.“

„У месячны тэрмін забіцца зьніжэньня фактычнага расходу апалу на чыгунцы ня меньш як на 15 проц.

(З адозвы ЦК УсеКП(б) і Саўнаркому аб чыгунцы).

.. Апал—адно з вузкіх месц нашай народнай гаспадаркі. Проблема апалу—узяць у першую чаргу вугаль і перш за ўсё з Донбасу. І тут мы павінны дабіцца рашучага палепшаньня, рашучага пералому, асабліва ў справе ажыцьцяўленьня задач мэханізацыі здабычы апалу.

У галіне апалу, як і ў галіне транспорту, мы маем яшчэ ня малыя рэшткі шкодніцтва. Імена ў гэтых галінах шкоднікі імкнуліся з асаблівай энэргіяй нанесьці здрадніцкія ўдары соцыялістычнаму будаўніцтву. Вось чаму сюды трэба накіраваць найбольшыя сілы, каб перамагчы цяжкасьці і неадкладна дабіцца рашучага пералому.“ (Молатаў)

20 вагонаў ня стала

Кіраўніцтва Лесаб'яднаньня БССР перадало менскаму гарадзкому пракурору рад фактычных матар'ялаў аб бясчынным выкарыстоўваньні апалу.

Лесаб'яднаньне адзначае, што, ня гледзячы на напружанае становішча з апалам, шмат прадпрыемстваў скарыстоўваюць яго не па прызначэньню. Прыкладам можа служыць шклозавод „Пролетары“ (Менск). Згодна пляну, зацьверджанаму Энэргбюро ВСНГБ на 1931 год, заводу патрабуецца 2700 кубаметраў дроў. Расход на месяц складае 225 кубамэтраў.


За час ад 2-га студзеня па 1-е лютага заводу адпушчана праз ЦРК 16 вагонаў дроў, акрамя таго, непасрэдна ў адрас заводу агружана 20 вагонаў дроў, што складае трохмесячны запас. Аднак-жа, 2-га лютага прадстаўнік заводу зьявіўся у Лесаб'яднаньне і заявіў, што на заводзе ўжо няма дроў.

—Калі-ж вы пасьпелі скарыстаць 20 вагонаў дроў?

Прадстаўнік заводу адказу ня даў.

Пракуратура рэспублікі даручыла сьледчаму г. Менску, тав. Цераху, у тэрміновым парадку пачаць сьледзтва па справе аб перавыдатку апалу. Тав. Церахаў мяркуе скончыць сьледзтва ў бліжэйшыя дні.

Гэрої злачынных адносін да апалу павінны стаць перад паказальным пролетарскім судом.



Зьменшыць апэтыты!

ЛЕПШ ЗАХАВАЦЬ АПАЛ

Палова адзінаццатай гадзіны ночы. Ударная брыгада „Чырвонай Зьмены“ ужо на „Эльводзе“. Пасьля невялікіх спрэчак з старэйшым міліцыянэрам мы праходзім на „Эльвод“.

Першае, што кідаецца ў вочы, гэта—сыравіна (гаручы матар'ял) валяецца без усякага парадку, без павеці, парасьціданая па ўсім двары.

Сыравіна пры такіх умовах траціць сваю якасьць, бо насякае вільгацьцю. Так яна і падаецца у кацельную.

У сучасны момант сыравіна прывозіцца на „Эльвод“ з ўсіх канцоў Беларусі. Апал паступае ў кацельную з 40-55 проц. вільгаці І зусім становіцца ясна, чаму на „Эльводзе“ няма добрых паказчыкаў у эканоміі апалу.

За адны толькі суткі станцыя спажывае 10 вагонаў торфу і 4 вагоны дроў.

Станцыя працуе у вельмі напружаным стане ішчы. У выпадку псаваньня катла частка гораду можа надоўга застацца бяз энэргіі.

На парадку дня „Эльводу“ пабудаваць паветкі для захаваньня апалу і мобілізаваць усе сілы, каб дабіцца лепшых паказчыкаў у галіне экономнага выдаткаваньня апалу.

Ударная брыгада „Ч. З“
Гельфанд і Левін

* * *

Газэты ўжо прыводзілі прыклады, калі на прадпрыемствах не вядзецца вучоту выдаткаваньня апалу і не прэміруюцца качагары. Як характэрны прыклад можна прывесьці чыгуналіцейны завод „Энэргія“.

На заводзе няма ніякага вучоту, ніякай экономіі апалу. Некалькі раз завод стаяў пад пагрозай застацца без апалу, а гэта значыць—спыніць работу заводу. Часам прыходзілася пазычаць апал на суседніх прадпрыемствах.

Зімою, пры вялікіх марозах, заводзкія катлы штодзённа пажыраюць цэла вагону дроў.

Завод павінен павесьці рашучую барацьбу з неэкономным выдаткаваньнем апалу, пары і электраэнэргіі. Грамадзкія організацыі, і ў прыватнасьці комсамольскі колектыў, павінны зараз-жа заняцца гэтай справай.

Н.

За 45 проц—ня меньш!

Вывучайце вопыт лепшых

Першымі ініцыятарамі організацыі соц. спаборніцтва, ударніцтва, скразных ударных брыгад і комун на заводзе „Комунар“ былі ў большасьці сваёй комсамольцы. Факты і лічбы гавораць аб тым, што колектыў комсамолу зав. „Комунар“ пад кіраўніцтвам партыйнага колектыву здолеў выканаць ускладзеныя на яго адказьнейшыя задачы.

Комсамол у час вытворчых манэўраў паказаў сябе як лепшы памочнік партыі працягваючы сваю працу і па скончаньню манэўраў. Пад кіраўніцтвам партколектыву, пры актыўным удзеле комсамолу, на заводзе створаны 7 вытворчых комун, 13 ударных брыгад, з якіх адна імя Х-га зьезду ЛКСМБ. 5 скразных, 1 штурмавал імя Х-га зьезду ЛКСМБ. Самакантрактацыяй і ўдарніцтвам ахоплены ўсе комсамольцы і большасьць беспартыйнай рабочай моладзі.

Комсамольцы былі першымі ініцыятарамі організацыі плянава-опэрацыйных груп, якімі цяпер ахоплена звыш 100 чалавек (37 проц. камсамольцаў і рабочай моладзі) з 80 прэмій звыш 40 атрымалі комсамольцы-ўдарнікі.

Колектыў сабраў звыш 150 прапаноў, што складае больш палові ўсіх прапаноў рабочых заводу. Комсамольскі колектыў узяў шэфства пад гэтымі прапановамі каб іх хутчэй рэалізаваць.

У час прапрацоўкі сустрэчнага прамфінпляну комсамольцы высунулі свой сустрэчны, які даў значнае павялічэньне ў параўнаньні з плянам заводакіраўніцтва. Напрыклад, прамфінплян кавальнага цэху намячаў выпусьціць 3108 пар піскоў, сустрэчны даў выкананьне 4105.

Калі закідчыкі ліцейнага цэху ня вышлі на работу і ўзьнікла пагроза зрыву адліўкі, дык комсамольцы, прапрацаваўшы свой рабочы дзень, заявілі, што ня пойдуць да хаты, пакуль ня зробяць адліўкі. Яны былі ініцыятарамі організацыі скразной брыгады па камнедрабілках, якая дала перавыканаьне прамфінпляну.

Тармозіць выкананьне прамфінпляну няўвязка паміж цэхамі і ў саміх цэхах. З матай зьнішчыць няўвязку, ячэйка такарнага цэху ўзялася за організацыю плянава опэрацыйных груп. Група з 34-х комсамольцаў і беспартыйнай моладзі ў барацьбе за прамфінплян паказала сваю жыцьцёвасьць і ў значнай ступені дамагла ліквідаваць недахопы ў цэху. Камсамольцы гэтага цэху высунулі сустрэчны прамфінплян, які па 23 проц. перавысіў кантрольныя лічбы заводакіраўніцтва.

Ячэйка бляшанага цэху правяла суботнікі па мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў. Комсамольцы падхапілі ініцыятыву плянава-опэрацыйнай групы такарнага цэху і такую-ж групу організавалі ў сябе. Група налічвае 24 чалавекі. За апошні час уступіла ў шэрагі комсамолу 18 чалавек, 5 комсамольцаў перададзены ў партыю.

„ТВАЯ СПРАВА— ВУГАЛЬ ВАЗІЦЬ“

Дрэнна пастаўлена экономія апалу на заводзе „Комунар“. Дробны вугаль не скарыстоўваецца і рассыпаецца па двары. Рабочыя ўнесьлі прапанову аб лепшым скарыстаньні апалу, вынайшлі машыну для пeратрускі дробнага вугалю, які можа пайсьці для патрэб адліўкі дробных частак і даць вялікі прыбытак для прадпрыемства. Але адміністрацыя заводу, у прыватнасьці загадчык вытворчага сэктару, бюрократычна адносіцца да гэтай прапановы.

На прапанову рабочага рэалізаваць сваё вынаходзтва дырэктар адказаў:—„У мяне часу няма займацца гэтым і ня дуры мне галаву“, а загадчык вытворчага сэктару адказаў: „Што ты дурня корчыш: У цябе з гэтага нічога ня выйдзе“.

Пасьля такіх адказаў рабочы сабраў трохі вугалю, што дарэмна выкідаецца, і давёў магчымасьць скарыстаць яго для адліўкі дробных частак. Тады загадчык вытворчага сэктару кінуў яму:—„Твая справа—вугаль вазіць, а ня ўмешвацца ў такія рэчы“.

Адпаведныя органы павінны заняцца гэтым пытаньнем, каб раз на заўсёды зьнішчыць падобныя бюрократычныя адносіны да такой важнай справы, як рабочае вынаходзтва.

Трохі лепш пастаўлена справа з экономіяй электрычнай энэргіі. Комсамольская брыгада сочыць за экономнасьцю выдаткаваньня электрычнасьці. Але назіраюцца адзіночныя выпадкі, што ў час абедзенага перапынку пакідаюць гарэць электрычнасьць, не выключаюць маторы.

На ўвесь цэх ёсьць адзін рубільнік. Калі выключаюць рубільнік, дык увесь цэх застаецца без сьвятла. Дзякуючы гэтаму, ля варштатаў, на якіх ніхто не працуе, часам дарэмна траціцца электраэнэргія.

Надалей „комунараўцы“ павінны дабіцца карэннага пералому ў справе экономнага выдаткаваньня апалу і электроэнэргіі.

Ударная брыгада „Чырв. Зьмены“:
Крутковіч, Слоўшчэр, Файн і Кульваноўскі.

НЕ ЗАТРЫМЛІВАЦЬ ТЭМПАУ БУДАУНІЦТВА МТС

„Затрымаць тэмпы—гэта значыць адстаць, а адстаючых б'юць!" (СТАЛІН)

Соцспаборніцтва, ударніцтва і сустрэчны плян—галоўныя рычагі ўдарнай падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы

Комсамол абавязан забясьпечыць сталёвую коньніцу кадрамі

Здалі позыцыі ў барацьбе за МТС

МТС адзін з асноўных сродкаў партыі і рабочае клясы па соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі на гэтай базе кулацтва як клясы.

Посьпехі ў організацыі МТС залежаць ад таго, наколькі ў раёнах партыйныя, комсамольскія, профсаюзныя і іншыя організацыі разгорнуць масавую работу сярод колгасьнікаў і бедняцка-серадняцкіх мас вёскі па распаўсюджваньню трактарных акцый, наколькі яны забясьпечаць станцыі кадрамі і г. д. і г. д.

Рад раёнаў па сёньняшні дзень не садзейнічае МТС. Да такіх адносяцца Сьмілавіцкі раён.

І невыпадкова Трактарцэнтр пры Наркамземе БССР рашыў перавесьці МТС з Сьмілавіцкага раёну ў Слуцкі, які пабальшавіцку паставіў работу і распаўсюдзіў трактарных акцый на 50 тыс. руб.

Гэтая пастанова Трактарацэнтру з усёй яскравасьцю сьведчыць аб тым, што ў Сьмілавіцкім раёне райком партыі і райком комсамолу, сваёй правапортуністычнай стаўкай на самацёк сарвалі організацыю МТС у раёне.

Гэтая пастанова зьявіцца ўрокам і для астатніх раёнаў.

Комсамол Смілаўшчыны ганебна здаў позыцыі ў барацьбе за МТС.

МТС НЕ ГАТОВА ДА СЯЎБЫ

Згодна пляну, у Стара-Дароскім раёне да пачатку вясеньняй сяўбы павінна быць організавана МТС. Але тэмпы работы па організацыі і абсталяваньню яе недапушчальна марудныя.

У мястэчка Старыя Дарогі мяркуецца прывесьці 55 трактароў з рознымі прычэпнымі сельска-гаспадарчымі машынамі. Для захаваньня машын патрэбна памяшканьне. Аднак і тыя 11 трактароў і сельска-гаспадарчыя машыны, што ўжо набыты, стаяць на двары. Да будаваньня гаража яшчэ не прыступалі.

МТС мае шмат сельска-гасадарчых машын і два трактары, якія патрабуюць рамонту. Але ў майстэрні і МТС няма патрэбных запасных частак. Таксама не хапае сельска-гаспадарчага інвэнтара, трактарных сеялак, барон, плугоў і г. д. Райколгассаюз і іншыя раённыя організацыі ня прымаюць энэргічных мер, каб забясьпечыць трактарную станцыю патрэбнымі запаснымі часткамі і сельска-гаспадарчым інвэнтаром.

Недапушчальна слаба разгорнута работа па распаўсюджаньню трактара-абавязацельстваў. А трэба па раёне рэалізаваць іх на 15.300 рублёў. Заданьне-ж выканана толькі на 18,8 проц. Сельсаветы і комсамольскія ячэйкі не праводзяць сярод колгасьнікаў і аднаасобнікаў гэтай работы.

Падрыхтоўка кадраў, трактарыстых і старэйшых механікаў праходзіць нездавальняюча. Толькі ў апошні час адчыніліся трактарныя курсы на 60 чалавек. Але да вясеньняй пасеўкампаніі курсы не пасьпеюць даць патрэбных кваліфікаваных трактарыстых.

Зусім слаба разгорнута масава-агітацыйная праца вакол МТС, як апорнага пункту колгаснага руху. Дагаворная кампанія паміж МТС і колгасамі праходзіць бяз актыўнага ўдзелу шырокіх мас колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Толькі 5 колгасаў заключылі ўмовы з МТС.

Комсамольскія ячэйкі ў сваёй працы па колектывізацыі і падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі не выкарыстоўваюць правядзеньне колдагаворнай кампаніі МТС з колгасамі для організацыі новага прыліву ў колгасы.

Бюро Старадароскага райкому і ячэйкі павінны зараз-жа ўсю сваю ўвагу зьвярнуць на МТС, каб дапамагчы ёй падрыхтаваць памяшканьне, скончыць рамонт, забясьпечыць комсамольскімі кадрамі і па-ўдарнаму правесьці падрыхтоўку да сяўбы.

Заслаўскі

Клясавы вораг зрывае падрыхтоўку кадраў

Падрыхтоўчая работа Сіроцінскай МТС да другой бальшавіцкай вясны праходзіць нездавальняюча. Трактарыстыя не падрыхтаваны на курсы старэйшых рулявых, куды было прынята 8 чалавек., (замест 12), папалі чужыя людзі, былыя пабаўленцы.

І вось гэтыя людзі (Гальперын, Гарадзеўскі, Максон), пралезшы ў комсамол і профсаюз, адзін за адным пачаклі ў Ленінград. Уцякла і „комсамолка" Берасьнёва П. Потым адазвалі з курсаў яшчэ аднаго чалівека—Пятрова. Курсы наведваюць цяпер толькі 5 чалавек.

Гэтыя дэзэртыры выпадкова папалі ў комсамол і профсаюзы дзеля сваіх скурных інтарэсаў.

Побач з дрэннай падрыхтоўкай кадраў, станцыя ня выканала і заданьня скласьці колумовы з колгасамі, не прывяла ў баявую гатоўнасьць трактары і рэшту машын.

Нельга абыйсьці моўчкі і комсамольскую організацыю раёну.

Палец аб палец ня вытнула яна каб дапамагчы выправіць прарывы ў рабоце МТС.

Сіроцінскі трактарысты

Курсы патрабуюць дапамогі

Пры Гародніцкім тэхнікуме механізацыі сельскай гаспадаркі ў сьнежні месяцы адчыніліся курсы старшых рулявых для Ветрынскай, Асьвейскай, Сіроцінскай, Гарадоцкай і Расонскай машына-трактарных станцый.

Каго-ж прыслалі на гэтыя курсы адзначаныя станцыі? Яны прыслалі людзей, якія не адпавядаюць прызначэньню курсаў, людзей якія ніколі ня бачылі трактара, мала-пісьменных, ды яшчэ з вялікім спазьненьнем. На курсах не хапае выкладчыкаў, што вельмі дрэнна адбіваецца на вучобе курсантаў.

Належныя органы павінны зьвярнуць увагу на гэтыя курсы і дапамагчы ім у рабоце.

Каланда-Жукін.

АДОЗВА АБ КАНТРАКТАЦЫІ НЕ РЭАЛІЗУЕЦЦА

Чашнікі (па тэлефону ад нашага спэцкора). Падрыхтоўка да вясеньняй пасеўкампаніі праходзіць па раёне нездавальняюча. Адозва ЦК і СНК аб падрыхтоўцы да вясеньняга севу і кантрактацыі пасеваў 1931 году не прапрацавана ні ў адным колгасе і вёсцы.

Комсамольскія ячэйкі нічога не робяць па рэалізацыі гэтай адозвы. Частка ячэек у падрыхтоўцы да вясновага севу абмежавалася выключна складаньнем брыгад на ачыстцы насеньня і падрыхтоўцы інвэнтара, у значнай частцы ячэек зусім выпала работа па організацыі колгаснага прыліву. Рад ячэек праводзяць у працы па колектызацыі права-опортуністычную практыку, спадзяюцца на самацёк.

Пузікаў

Каляндар НКЗ аб падрыхтоўцы да сяўбы ня выконваецца

Сьмілавічы, 12 (Ад нашага юнкора).—У падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай вясны Сьмілавіцкі раён ня ўзяў бальшавіцкіх тэмпаў. Раённыя організацыі ня зделялі мобілізацыю масы на выкананьне пасеўпляну, на барацьбу з кулаком і яго агентураў, якія зрываюць падрыхтоўку да пасеўкампаніі.

Пасеўплошча раёну павялічваецца сёлета на 3780 гэктараў, але аб гэтым ні колгасьнікі, ні бядняцкія, ні серадняцкія пласты вёскі ня ведаюць.

Пляны да вёсак і да аднаасобных гаспадарак не даведзены.



На здымку: Комсамольцы колгасу „Ленінец" Броньніцкага р-ну прапрацоўваюць плян пасеўнай кампаніі.

Лічбы б'юць трывогу.

Згодна пляну трэба ссыпаць 567,5 тон насеньня, ссыпана толькі 450. тон, альбо 80 проц.

Камітэты ўзаемадапамогі павінны былі ссыпаць да 1-га лютага 201 тону, а ссыпалі толькі 72.

Яшчэ горшая справа з ачысткай насеньня. На пляну колгасы павінны ачысьціць 380 тон, ачышчана 166,52 проц. Індывідуальны сэктар павінен ачысьціць 1430 тон, а ачысьціў толькі 300,—22 проц. Попелу сабралі толькі 21 проц.пляну.

Шэраг сельсаветаў ня мае яшчэ пасеўных плянаў, а падрабязных плянаў вясеньняй пасеўкампаніі ня склаў яшчэ ніводзін з 48 колгасаў раёну.

З кадрамі дрэнна.

У Сьмілавічах працуюць толькі курсы рахункаводаў. Займаецца 19 чалавек. Курсы паляводаў і старшынь колгасаў, разьлічаныя на 70 чалавек, яшчэ не распачыналі працы.

Курсы трактарыстых, якія ўжо працавалі, распушчаны, бо Колгасцэнтр рашыў ліквідаваць у раёне МТС і перавёў яе ў Слуцкі раён.

Замест машына-трактарных станцый у раёне застаецца трактарная калёна з 8 трактароў, з якіх толькі 4 могуць працаваць. Рамонт інвэнтара праходзіць нездавальняюча.

Соц. спаборніцтва і ўдарніцтва, гэтыя мэтоды комуністычнае працы, зусім ня ўжываюцца ў падрыхтоўцы да сяўбы.

Дырэктыва партыі і ўраду аб кантрактацыі ня выконваецца.

Г. Фрыд

ШЛЯХІ НОВАГА ЖЫЦЬЦЯ

(Ад нашага спэцкора)

Раніца. На кругавідзе вынікла вёска, хаотычна раскінуўшы чорныя пасмы будынкаў па асьнежаным полі. За вёскай мутна-блакітнаю стужкай цягнецца хваёвы лес, прыбраны ў сьнежны вэлюм марознай зімы.

Усё бліжэй і бліжэй вёска, усё ясьней вырысоўваюцца будынкі, дрэвы. Ужо відаць як павольна кланяюцца „жураўлі", чуваць рэў жывёлы.

Вёска ўжо ўстала. Жыцьцё пульсуе поўным ходам.

— А вунь і Малінаўка! Там колгас „Прогрэс" паказваючы пугаўём улева на чорныя ўзгоркі хат,—азваўся мой фурман.

— А ўсё-ж ў колгасе куды лепш. Па-мойму, толькі колгас карэнным чынам зьменіць жыцьцё селяніна, палепшыць яго дабрабыт,—дадаў ён, лагодна папукваючы спрытную кабылку.

Простыя, праўдзівыя словы селяніна былі прасякнуты ўпэўненасьцю ў перавагу колектыўнай гаспадаркі, надзеяй на лепшае жыцьцё толькі праз колгас.

— Но-о, „Мілая"! Давай па-ударнаму! Тэмпы пакажы, тэмпы...

...Памятаецца вясковы вечар

Невялькі хвілін язды трушком, і сані, паскрыпваючы спыняюцца. „Мілая" паважна ківае галавой, нібы вітаючы спаткаўшых нас колгасьнікаў. Перабіваючы адзін аднаго, раскаваюць колгасьнікі пра сваё новае колектыўнае жыцьцё, працу на колектыўных палёх, пра цяжкія мінулыя часы, часы крыўды, пакуты і зьдзеку.

— Эх, добра памятаецца адзін вясковы вечар!—загаварыў стары колгасьнік у рудым кажуху. Вочы заблішчэлі агнём бязьмежнай злосьці. Стала ціха. Стары акінуў двор зацьмелымі вачыма.

— Памятаюцца енкі і стогны бедака-селяніна, плач і слёзы тых, хто з маленства быў пакорлівым нявольнікам кулака, не разгінаючы сьпіны цягнуў непасільнае ярмо. Нуда, крыўда, голад...

Адышлі яны ў далёкую смутную мінуўшчыну! Людзі зажылі цяпер па-новаму, па-сучаснаму.

Мне старому хацелася б вярнуць моладасьць, каб моцным будаваць новае жыцьцё, аддаць яму ўсе сілы. Закарэлыя пальцы чухалі патыліцу.

... У колгасе куды лепш

— Нічога, дзед, адпачні! Ёсьцьжа ў нас у колгасе фонд на ўтрыманьне непрацаздольных. Будзеш рабіць, што зможаш. Не—дык і на печы пасядзіш... Зробім мы.

Ідзем аглядаць стайню.

— Вось і палацы для нашых коняй! Янка Воўкаў увёў у прасторную стайню, надзеленую перагародкамі на стойлы. У кожным—спэцыяльная кармушка.

— Гной ззаду наперад адкідаем, каб конь не стаяў уніз галавой. Гэта для яго шкодна... Кроў ідзе ў галаву,—дадаў ён клапатліва рассыпаючы па кармушках авёс.

— Вунь тыя два будынкі і гэты—нашыя стайні. Разьлічаны на 50 коняй. А там аборы, сьвінарнікі, аўчарня, гумны, сьвірны,—размахваў рукамі Янка.

— Дзе вам лепш жывецца,— ў колгасе ці, як даўней было?—спытаўся я ў Воўкава Ігната.

Ён моўчкі вазіўся ля каня, нібы рыхтуючыся да вялікай прамовы.

Накідаючы падсядзёлак, раптам пачаў:

— У колгасе працаваць вядома куды лепш, чымся асобнай гаспадаркай. Аднаасобнік рве вантробы, капаючыся па сваёй палосцы, але часамі галодны сядзіць. Працаваць яно вядома ўсюды трэба, ці то ў колгасе, ці на заводзе. Бяз працы нічога ня будзе...

...Кіпіць работа

Колгас „Прогрэс" організаваўся 10-га лютага 1930 г. Малады колгас прайшоў невялікі, але цяжкі шлях.

— Цяжка было пры організацыі колгасу,—кажа старшыня Бароўскі,—з аднаго боку сялян пужала і непакоіла невядомасьць, а з другога кулацкія плеткі. Кулакі гаварылі, што ў колгас заганяюць сілком, ў колгасе сялянін будзе босы і голы, што ў колгасе ўсе надохнуць з голаду, будуць прымушаць рабіць, а даваць нічога ня будуць.

У колгас спачатку ўступіла 17 гаспадарак. Добрая работа і прыкладнае вядзеньне гаспадаркі сталі лепшым агітатарам за новы прыліў.

В. Сідарук.

(Працяг будзе)

Час. вык. абав. адк. рэдактара— С. АНІСАЎ

Друкарня імя тав. Сталіна Галоўлітбел № 599